**Людына, А.** Фотаздымкі апавядаюць, або падарожжа па нязведаных старонках гісторыі / А. Людына // Зара (Бешанковічы). – 2018. – 13 лют. – С. 3.

**Фотаздымкі апавядаюць, Падарожжа па нязведаных старонках гісторыі**

*29 год мінула з дня вываду савецхіх войск з Афганістана, але з цягам часу афганскі боль не сціхае. Сярод тых, хто прайшоў праз афганскі горан – шмат знаёмых, пра каго газета не раз пісала, людзей шаноўных і паважаных. Вось і вырашылі мы наведацца ў гісторыка-краязнаўчы музей, каб зрабіць падарожжа па яшчэ нязведаных старонках гісторыі «вайны за ракой».*

*У фондах музея сярод іншых рэчаў захоўваецца спіс нашых землякоў, якім давялося выконваць свой інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан. Іх 55 – мужных, верных прысязе, Радзіме і воінскаму абавязку сыноў бешанковіцкай зямлі. Напрыклад, маёр Валерый Віктаравіч Сафонаў і прапаршчык Канстанцін Мікалаевіч Звездзянкоў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трэцяй ступені, маёр Фёдар Іпалітавіч Яжэнькін – ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трэцяй ступені і медалём «За адвагу», радавы Ігар Мікалаевіч Скуратаў адзначаны медалямі «За адвагу» і «Воіну-інтэрнацыяналісту ад узячнага афганскага народа», капітан Аляксандр Іванавіч Каралёў – ордэнам Чырвонай Зоркі. Спіс гэты можна працягваць.*

**ВЫЖЫЦЬ І ВЯРНУЦЦА**



Жыццё выпрабоўвае кожнага чалавека. Выпрабоўвае на грамадзянскую сталасць у працы, ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі. Аднак ва ўсе часы існавання чалавецтва самым высокім застаецца выпрабаванне на вернасць грамадзянскаму абавязку перад сваёй дзяржавай, Радзімай. Такое выпрабаванне выпала на долю Ігара Васільевіча Спірыдовіча.

У рады Узброеных Сіл СССР быў прызваны ў 1986 годзе, трапіў у пагранічныя войскі. Служыць давялося ў горадзе Кіркі, што ў гарачай Туркменіі. А пасля вучобы ў душанбінскай сяржанцкай школе будучы санінструктар Ігар трапіў у Афганістан (правінцыя Фарыят), дзе служыў да поўнага вываду нашых войск з Дэмакратычнай Рэспублікі.

Тым часам баі з «духамі» ішлі не на жыццё, а на смерць. І яна прыходзіла...

Ігару Васільевічу даводзілася аказваць медыцынскую дапамогу не толькі сваім, але і салдатам афганскай урадавай арміі, мірнаму насельніцтву. Яно таксама пакутавала: і ад ран, і ад розных хвароб. Здаралася, што за дзень да 30 жыхароў звярталася, нікому не адмаўляў санінструктар...

У мірным жыцці І. В. Спірыдовіч – чалавек слова і справы, на якога заўсёды можна спадзявацца. Напэўна, кожнаму з нас хацелася б мець такога сябра. Ігар Васільевіч ужо 20 гадоў працуе лесніком у Астровенскім лясніцтве і прызнаецца, што ніколі не пажадае сваім сынам і знаёмым прайсці праз вайну. Як ніхто іншы, ён асабліва цэніць мірны дзень, даражыць сваёй сям'ёй і работай.

*Анжэла* ***ЛЮДЫНА***
*Фота з фондаў музея*